Год II. Пятніца, 4 лютага (феўраля) 1921 г. № 5.

НАША ДУМКА

Палітычная, экономічная і літэратурная тыднёвая газэта

ПАДПІСКА: на 3 месяцы 75 марак або 5 ф. мукі. | Цана асоб. нумэру 6 марак. | Адрэс: Вільня, Вострабрамская 5 (Пасаж).

Канец Віленскага Сойму.

У газэтах за 1 лютага зьявілася пісьмо польскага міністра закардонных спраў князя Сапегі да генарала Жэлігоўскага аб тым, што Польшча па розных прычынах не хацела-б, каб Урадуючая Камісія Сярэдняй Літвы і надалей працавала ў кірунку скліканьня у Вільні Сойму.

Ген. Жэлігоўскі прызнаў правільнымі прыведзеныя ў пісьме аргумэнты і загадаў спыніць прыказ аб выбарах у Віленскі Сойм на неазначаны час.

І так, ня раз ужо адкладаныя выбары ў Сойм — спынены. Выбараў ў Сойм покуль што ня будзе. Замест іх адбудзецца (?) плебісцыт, на які Польшча дала Лізе Народаў сваю згоду яшчэ 7 студзеня 1920 году.

На якой тэрыторыі будзе адбывацца плебісцыт?

На гэтае запытаньне мы маем такі адказ у пісьме кн. Сапегі.

Польскі Урад 7 студзеня 1920 г. даў сваю згоду Лізе Народаў правесьці *плебісцыт на тэрыторыі на ўсход ад лініі, азначанай Вярхоўнай Радай 8 сьнежня* 1919 *году.*

Лінія гэтая больш-менш ідзе ад Бярэсьця (Брэст-Літ.) праз Бельск, Саколку, на захад ад Горадні, і далей амаль што па зялезнай дарозе Горадня-Вільня-Дзьвінск.

Усё-ж такі трэба сказаць, што да апошняга часу граніцы тэрыторыі, на якой мае адбыцца плебісцыт, ня вызначаны аканчальна. Сказана: „на ўсход ад лініі 8 сьнежня 1919 г.“, але ня сказана, які абшар па ўсход будзе захоплен пад плебісцыт. Ці ён скончыцца на граніцы, устаноўленай па бальшавіцка-літоўскаму дагавору 12 ліпеня 1920 г., ці захопіць і тэрыторыі, уступленыя бальшавікамі Польшчы па пралімінарнаму дагавору ў Рызе.

Усё гэта пытаньні, на якія павінна даць адказ будучыня.

Перад намі покуль што факт згоды Польшчы на плебісцыт і факт спыненьня генаралам Жэлігоўскім скліканьня Віленскага Сойму.

Абодва факты маюць досыць вялікую вагу. Першы—таму, што пасьля яго Польшча ня можа ужо падтрымліваць Сярэдняе Літвы і яе Ураду, другі—таму, што ім у корані падрываюцца матывы так званай сярэдня-літоўскай палітыкі.

Гэтага трэба было чакаць.

Пасьля адмовы ад учасьця ў выбарах у Віленскі Сойм з боку яўрэяў, беларусаў, ліцьвіноў і групы палякоў, Віленскі Сойм, выбары ў каторы усё адкладаліся і адкладаліся надалей, стаў проста міфам, пустой камэдыяй.

Амэн.

Плебісцыт.

За апошнія дні пытаньне аб тым, як у канцы-канцоў вырашыцца доля Віленшчыны, ізноў стала на чаргу дня.

Палітычная Камісія Польскага Сойму у Варшаве вынесла сваю рэзалюцыю, каторая павінна яшчэ быць разгледжана агульным сходам Сойму. У рэзалюцыі гаворыцца, паміж іншым, што Віленшчына складае неаддзялімую часьціну польскае нацыянальнае тэрыторыі, што Польшча ня прызнаець ніякай юрыдычнай сілы за літоўска-бальшавіцкім дагаворам 12 ліпеня 1920 г., што Польшча згаджаецца на плебісцыт, каторы хоча правесьці у Віленшчыне Ліга Народаў для вырашэньня пытаньня, да каго будзе належыць спорная тэрыторыя: да Польшчы ці да Літвы. Аднак, Польшча ня можа чакаць вынікаў плебісцыту і прызнае патрэбным найскарэй зьнесьці адміністрацыйную і вайсковую абасобнасьць Віленшчыны ад Польшчы. У гэтай рэзалюцыі цікава паміж іншым тое, што Камісія Варшаўскага Сойму выразна стала проціў Віленскага Устаноўчага Сойму Сярэдняй Літвы, проціў Сярэдняй Літвы, як незалежнай ад Польшчы адміністрацыйнай і вайсковай адзінкі. Камісія спадзяецца, што вынік плебісцыту будзе на карысьць Польшчы.

Зусім іначай аб тым-жа гавораць Літоўскі Ковенскі Сойм і літоўскія міністры. У Коўні лічаць, што Вільня, як была заўсёды літоўскай сталіцай, так і цяпер павінна застацца ёю. На пытаньню аб прыналежнасьці Вільні і бліжэйшых да яе мясцовасьцяў не павінна быць ніякага плебісцыту, каторы можа адбыцца толькі на больш-менш аддалёных ад Вільні тэрыторыях Сярэдняй Літвы і навет па-за яе межамі, напрыклад, ў Слонімскім, Ваўкавыскім і іншых паветах Горадзеншчыны і Меншчыны. Літоўскі Сойм і Урад разьлічаюць, што беларусы і яўрэі, засяляючыя спорныя плебісцытныя тэрыторыі, выкажуцца на карысьць Літвы.

Што ліцьвіны маюць рацыю спадзявацца на падтрыманьне з боку беларусаў і яўрэяў, калі можа ня усіх, то пераважваючай іх большасьці, у гэтым ня прыходзіцца сумлявацца. Тутэйшае і ковенскае яўрэйства цягне за Літву, бо яно у Ліцьве карыстаецца нацыянальна-пэрсанальнай аўтаноміяй і роўнымі правамі. Беларусы, як прыходзіцца з усіх бакоў чуць, таксама у аграмаднай большасьці за Літву.

З беларускім урадам Ластоўскага Літоўскі Урад, як ведама дайшоў да згоды, што пад час плебісцыту беларусы і ліцьвіны будуць стаяць за адно—за Літву. Прадстаўнікі беларускага Ураду Ластоўскага прадставілі Лізе Народаў мэморыял, у каторым заявілі, што калі Ліга будзе праводзіць плебісцыт, то ежалі ня можна, каб плебісцыт адбываўся паміж трыма: Польшчай, Літвой і Беларусьсю, то тады формула плебісцыту павінна быць такая: 1) за Літву і Беларусь (разам) і 2) за Польшчу.

Што датычыць палякоў, то і сярод іх ёсьць група, якая лічыць, што край наш павінен адыйсьці да Літвы, а не да Польшчы.

Як бачым, абедзьве староны рыхтуюцца да плебісцыту, але па пытаньню аб плебісцытнай тэрыторыі не дайшлі яшчэ да поўнай згоды.

Мы, Беларусы, знаходзімся цяпер і мусіць будзем знаходзіцца пры плебісцыту ў асобным палажэньні.

Трудна спадзявацца, што плебісцыт дасьць нам магчымасьць галасаваць за Беларусь. З намі Ліга Народаў і наагул амаль усе яшчэ мала лічацца, бо аб нас мала ведаюць, бо наш нацыянальны рух толькі набірае яшчэ сілы і ня выліўся ў магутны парыў усяго народу быць незалежным і непадзельным. Мусіць-што нам прадстаіць яшчэ перажыць многа гора і ўсялякіх падзелаў, каб потым,— мы верым, што скора, — паўстаць уваскросшымі.

Покуль мы не паўсталі незалежнымі, мы павінны выбіраць дарогі, якія найшыбчэй і найвярней вядуць у гэтую абетаваную зямлю.

Гісторыя знае, што беларусы ня крыўдзіліся на ліцьвіноў, калі увайшлі калісьці у склад „Вялікага Князьства Літоўскага“. Жылі разам дружна, паважаючы і шануючы адзін аднаго.

Добры прыклад старыны няхай і цяпер падкажа кожнаму беларусу адказ на магчымае плебісцытнае запытаньне: 1) за Літву ці 2) за Польшчу?

— За Літву і Беларусь!

Віляньчук.

Час аб'яднаці сілы.

Нашыя нацыянальна - палітычныя сілы растуць з нявымоўнаю шпаркасьцю, і ўжо выяўляюць нешта значнае і дужае настолькі, каб ня даць зарэзаць наша соннае шматміліёнае народнае цела.

Аднак-жа, што мы бачым? Мы можам, ня стыдаючыся прызнацца, што аказаліся ў пару рыскіх перагавораў менш арганізаванымі, менш стойкімі, чымся ў часе Берасьцейскіх нямецка-бальшавіцкіх перагавораў.

Успомнім толькі, што тады магутна разлёгся голас нашае Рады Рэспублікі аб незалежнасьці Беларусі і няпрызнаньні ёю, — новаю вольнаю дзяржаваю, — ганебнае для сябе, чужацкае Берасьцейскае ўмовы.

Голас незалежнай Беларусі шырокім клінам ур заўся ў Берасьцейскі трактат і моц гэтага трактату адразу выйшла з вялікаю шчэлінаю,

Маладая, рэволюцыйная Беларусь шчыльна згуртавалася вокал клічу „незалежнасьці і непадзельнасьці“ і паказала нязвычайна моцную еднасьць і дысцыплінаванасьць у сваёй рабоце.

Але, нажаль, усяму бывае канец і, ад пэўнага часу, лопнула і наша дысцыпліна. Што мы былі моцны і доўга ўсёю грамадою йшлі поруч—сьведчыць аб гэтым гісторыя. У той час, як у нашых братоў украінцаў закіпела ўсюды атаманшчына, лацьвійцы правілі некалькі месяцаў сваёю рэспублікаю з ангельскага карабля, літоўцы перажылі спробу рэволюцыі,—у гэты час мы яшчэ моцна ступалі па аднэй дарозе, па няўхільным шляху самастойнае Беларускае Народнае Рэспублікі.

А што-ж разьбіла нашу моц? І ў гэтым, каму служыць яшчэ памяць, можна паволі разабрацца. А разабраўшыся і падлічыўшы свае абмылкі, лёгка ўхіліцца ад далейшых няўдачаў і далейшага раскісаньня і распаўзаньня ва ўсе бакі.

Мусім згадзіцца, што час ужо прызнаць найбольшаю палітычнаю абмылкаю раскол Рады Рэспублікі ў сьнежні 1920 мінулага году.

Раскол выказаўся ў тым, што адна частка Рады пашла на поўную згоду з палякамі і утварыла, замест Рады Рэспублікі, „Дырэкторыю“ з 5 асобаў пад хаваючым назовам „Найвышэйшае Рады“.

Другая, рэволюцыйная часьць Рады Рэспублікі, утварыла габінэт Вацлава Ластоўскага.

Староньнікі Найвышэйшае Рады, ячія засядалі ў дзень расколу саўсім у прыватным памяшканьні, свабодна палітыкавалі сабе з окупацыйнымі адміністратарамі, а рэволюцыйны кавалак Рады Рэспублікі мусіў на час ад 1—2 месяцаў адлаць сваіх павадыроў разам з старшынёю міністраў Ластоўскім да Менскага вастрогу. Члены Рады Рэспублікі разам з ім былі адміністрацыйным парадкам арыштованы ўла-

даю Начальніка Менскага Вокругу (губэрнатара) за „незаконны сход“.

Рэзультаты гэтае нашае палітычнае абмылкі—вельмі простыя, яны перад вачыма ўсяго нашага грамадзянства і надта шмат гаварыць аб іх ня трэба.

Побач з „найвышэйшай“ радаю, пачалі зьяўляцца новыя, да яе падобныя урады, як напр., беларускі ўрад пры бышай арміі Балаховіча, зроблены п. Аляксюком.

Пасьлізнуўшыся раз, ня страшна ўпасьці другі раз. І без'языкая, нікому невядомая „найвышэйшая“ рада пяцёх, куды трапілі і саўсім выпадковыя элемэнты, калі так можна сказаць, прафэсыяналы нашага руху,—маўчала перад палякамі, маўчала нат тады, калі ня можна было маўчаць.

Урад Ластоўскага і яго староньнікі мусілі заняць ў адносінах да палякоў нелегальнае і, разумеецца, варожае палажэньне, хутка выбраўшыся за граніцу.

Рада пяцех, якая да сягоньняшняга дня ня выдала а ніякай публічнай дэкларацыі аб сваім існаваньні, занялася „тайнаю дыплематыяй“ і, нарэшце, за кароткі час да польскага адступленьня з-пад Бярэзіны, дацілася аж да падпісаньня „тайнае“ умовы з палякамі аб нацыянальна-культурнай аутаноміі у больш - менш агульных рысах („Przymierze“ № 2, 16.I--1921; артыкул „Narody odrodzone w roku ubiegłym“ (Białoruś).

„Дыктатура“ пяцех вырадзілася саусім, дайшоушы падпісаньнем гэткае ганебнае умовы да адрачэньня ад ідэалу нашай дзяржаунасьці.

Урад Ластоўскага зусім разумна трымае штандар незалежнасьці незапэцканым у руках сваіх.

1921 год мы ня можам жыць пры нейкай, непатрэбнай нам, падвойнасьці цэнтраў. З дня абвяшчэньня незалежнасьці роднае Рэспублікі скора будзе ўжо 3 гады. Пара зрабіць грунтоўную спробу спраўджаньня гэтай незалежнасьці, пара сабраць усю нацыянальную моц у кірунку гэтага спраўджаньня.

Ня лішне будзе пералічыць некаторыя абмылкі, што паслужылі мосьцікам да расколу дзяржаўнае Рады.

Галоўныя з гэтых абмылак дзьве:

1) Сьляпая вера ў адозвы і

2) Страх, што Рада Рэспублікі будзе разагнана.

У першым выпадку, вінавата наша малая вышкаленасьць у палітыцы: палітыка пачуцьця, а не цьвярозай развагі заўсёды бывае няўдачнаю.

Сьляпы кірунак на Варшаву пры супроць польскім настроі народа — гэта проста недараваная недалёкасьць.

А так—мы бяз хаты, пры разьбітым карыце.

Той, хто піша гэтыя радкі, воляю гісторыі апынуўся ў нэйтральным палажэньні, паміж дзьвюма старанамі, і сымпатыі свае схіляе не да палітычных банкрутаў, не да ўступчывых „культурна-аўтаномістаў“, а да тых, хто да канца вытрымае народнаю воляю падняты штандар незалежнае, самастойнае, нацыянальнае дзяржаўнасьці.

Але аднае сымпатыі мала і я клічу ўсіх, у кім гарыць жаданьне волі і шчасьця Бацькаўшчыны, падтрымаць свой штандар усімі сіламі, арганізована, дружна, як адзін чалавек.

Папераджаю ўсіх, што выйсьці з праступнага нэйтралітэту я рашыў сам, што да думкі аб концэнтрацыі ўсіх сілаў дайшоў без падказаваньня збоку. Зьвяртаючыся да тых, хто збанкрутаваў на орыентацыі, магу толькі з болем у сэрцы іх з гэтым павіншаваць і сказаць: „Вас ашукалі, паночкі, дык будзьце й вы ашуканцамі, але ня „тайнымі дыплёматамі“, якімі былі вы дасюль, ашуківаючы сваё грамадзянства... Плацеце й вы гэтакай палітыкай прыяцялем вашым, але рабеце гэта арганізована, з ведама аднаго, аўторытэтнага для ўсіх нас (і для вас, паночкі), цэнтру“.

Але што-ж! Для Вашых Дырэктарскіх Міласьцяў я—малы чалавек, зацёрты доляю і падзеямі мінулага году,—хаця Усебеларускі Конгрэс, на які й вы ссылаецеся, выбраў мяне сябром Выканаўчага Камітэту гэтага зьезду; хаця мой голас адважна раздаваўся ў пасяджэньні Рады Рэспублікі 25 сакавіка 1918 году ў дзень абвяшчэньня Бацькаўшчыны незалежнаю рэспублікай; хаця мая істота ў мамэнт разгону Конгрэсу бальшавікамі адважна вылезла наперад у цэнтры барыкадаў перад твары чырвонаармейцаў камісара Крывашэіна. Я адкінуў камісарскі партфэль пасьля разгону зьезду, які прапанаваў мне Камісар Нацыянальных Справаў Бэрсон. Тайных дагавораў я складаць ня ўмею.

„Хто мае вушы, каб чулі—хай чуе“.

Хто згаджаецца з тым, што аб'яднацца нам пара, што Бацькаўшчыну ратаваці трэба, хай далучыцца да майго голасу.

А калі згода, — дык да практычнае працы:

Да аб'яднаньня.

Нам трэба дабівацца ад свайго законнага Ураду, каб прыняў ён усе меры для скліканьня Рады Рэспублікі.

Як гэта зрабіць можна параіцца на конфэрэнцыі членаў Рады і старшыняў нацыянальных арганізацыяў, альбо інача як-небудзь, адным словам: час выйсьці з нядзейнага становішча ўсім нашым сілам, час аб'яднаць гэтыя сілы.

Бо бяз гэтага можам дайсьці да генаральнага банкруцтва.

Краўцоў Макар.

Л. 17/1 1921.

Ад Рэдакцыі. Маючы іншыя пагляды на закранутую артыкулам Краўцовага Макара справу, з прыемнасьцю адчыняем страніцы „Нашае Думкі“ для ўсякага сумленнага асьвятленьня тае справы. Перапрашаем паважанага аўтара за некаторыя пакарочаньні.

Арцыбіскуп Грынявецкі у ролі эндэцкага агітатара у Вільні.

Яшчэ раз—невядома каторы — падцьвярджаецца тое, што вельмі часта людзі, парваўшыя зусім адносіны з народным прошлым сваіх бацькоў, нязвычайна варожа выступаюць проціў ўсяго таго, што ім можа прыпомніць іх запраўднае пахаджэньне. Лішні раз бачым гэта ў арцыбіскупе Грынявецкім. Хто ён? Сын беларускага (або украінскага) шляхціца з Беласточчыны, аб чым выразна гаворыць яго саўсім ня польская фамілія. Шмат гдзе на Беларусі спатыкаем вёскі якія завуцца Грыневічы, шмат праваслаўных носіць гэтую фамілію. Чуў, што нат папы ёсьць з гэтага роду

Вось у 90 гадох з волі Апостольскай Сталіцы і цара Аляксандра III бачым мы ў старадаўнай біскупскай сталіцы ў Вільні духоўным пастырам Караля Грынявецкага. Так ён зрабіўся біскупам сотняў тысяч беларусаў-каталікоў, жывучых ў Віленскай дыэцэзіі. Гэтая сярмяжная маса цэлаю грамадой вітала біскупа, калі першы раз пераступаў ён парогі катэдры, сустрачала яго, калі аб'яжджаў многапакутную дыэцэзію і горка плакала ў тую сумную для народу гадзіну, як пад націскам царскага ураду, пакідаў ён Вільню, каб да яе болей не вярнуцца.

Ад таго часу прашло 35 з лішкам гадоў. Беларускі народ за гэты час шмат перажыў і зажадаў цяпер волі і лепшага жыцьця, дамагаючыся ў асобе сьвядомых сваіх сыноў незалежнасьці сваей бацькаўшчыны. І што сказаў яму цяпер яго былы, так горача калісь каханы пастыр? Людзі кажуць, што ў цярпеньні душа дасьпявае і багацее ў асобны род мудрасьці, якую дужа пекна вясковы пясьняр Сыракомля назваў „мудрасьць цярпеньня“. Гдзе-ж яна гэта мудрасьць ў арцыбіскупа Грынявецкага, які варочаецца да Вільні пасьля блізка 40 горкіх лет жыцьця ў выгнаньні?? На жаль яе саўсім мы ня бачым. Напрыклад, прыехаўшы да Вільні, у канцы лета 1919 г. да калішняй сваей дыэцэзіі, ў каторай жывуць палякі, беларусы, ліцьвіны, украінцы, ці хоць адным словом арцыбіскуп абмовіўся, што вітае ўсе свае бышыя авечкі, ня гледзячы на ўсе розьніцы, якія вытварыла сярод іх жыцьцё? Ці сказаў ён, што нікога ня гоніць, але сваім пастырскім сэрцам гатоў усіх абняць, усё зразумець, усё даравать, калі што дрэннага было зроблена? Ці высокі і доўга жданы госьць хоць адным словам выказаў жычэньне мець асабісты кантакт з беларусамі, прынамся каталікамі, выслухаць іх, абзнаёміцца з імі бэспасрэдня, ня цераз эндэцкіх агітатараў? Нічагусенькі! І летам 1919 г, і зімою 1921 г. стары арцыбіскуп проста з мосту пачынае, быццам малады прокуратар ў судзе, вінаваціць ўсё беларускае. Хай было-б гэта абвінавачаньне крыху абаснованым, на жаль ня бачым у ім ніякага толку і бесстароннасьц,—от звыклая сабе эндэцкая мякіна, якою агітатары з гэтай партыі прывыклі карміць безкрытычную віленскую вуліцу. Сам арцыбіскуп гаворыць, што ў 90 гадох для расейскага ўраду беларушчына служыла толькі пакрыўкаю для змаскаленьня і справаслаўленьня беларусаў. А як цяпер ёсьць? Ня зьверху, як тагды, але зьнізу народных мас, з курнай хаты сялянскай і з засмоленага фабрычнага варштату, пачалася цяпер народная беларуская работа. Гэты самы расейскі урад сурова караў першых работнікаў беларускай справы, баючыся ўходу беларусаў з пад пад ўплываў Масквы. Гэты-жа расейскі ўрад быў той думкі, што беларуская справа гэта замаскованая палёнізацыя і абкаталічаньне Паўдн. Заход. Краю. Добра вядомы арцыбіскупу кс. Сэнчыкоўскі быў не беларус, а польскі гэрбавы шляхціц, кар'ерыст, для царскай ласкі гатовы і душу запрадаць! Відна, арцыбіскуп Грынявецкі саўсім незнаёмы з беларускім рухам, які ў цяперашняй форме датуецца ад 1905 г. А калі ён ня знае ні нас, ні нашых дамаганьняў, дык чаму, як сьляпы аб калёрах бярэцца судзіць аб беларусах?! Мова наша ня сяньня атрымала назову беларускай, а што яе на жаль ня ўсе беларусы прызнаюць пакуль што за сваю, ды ня дзівота: маемо тутака рэч з так св. масоваю псыхозаю, калі шмат людзей ідзе на вудачку якой факшывай ідэі. Ніколі гэткая псыхоза ня можа быць пункатм выхадным, але як кожная хвароба, патрабуе сур'ёзнага лячэньня. Вельмі нам прыкра дакызываць арцыбі-

А. КАНЧАР.

Клясавае, нацыянальнае і рэлігійнае змаганьне на Беларусі.*)

Клясы нявытворчыя.

4. *Кляс шляхоцка-панскі.*

Беларуская баярская (зямянская і служылая) інтэлігенцыя старой фармацыі, яшчэ ў XV—XVI в. прыняўшы каталіцтва, перадалася на бок Польшчы і ўтварыла так званы дробна-панскі кляс—„шляхту“. Кляс шляхты, дзякуючы сваёй асаблівай псіхолёгіі меў мала агульнага з расейскім дваранствам. Астатняе ў адносінах да працоўнага сялянства было зямельнай эксплуатыруючай буржуазіяй, тыпам запраўднага фэодалізма, тады як беларуская шляхта з пачатку свайго фармаваньня (XIII—XIV в.) выяўляла сабой рыцарства, а затым з разьвіцьцем польска-шляхоцкага земляўладаньня, стала малазямельным, ато і зусім безьзямельным клясам магнацкіх прыжывалаў, даручных, арандатараў-чыншавікоў, намесьнікаў і проста улюбенцаў і гультаёў.

У часе II падзелу Польшчы (1795 г.) к Расеі адыйшло ўладароў двароў і шляхты больш за 50 тысяч. чалавек і дробнай чыншавой шляхты больш за 180 тысяч чалавек мужчын і жанчын. У ранейшыя часы польскія паны даражылі шляхтай і ўсяк ёй патуралі. Яны раздавалі ёй розныя пасады, дарылі маемасьць, граматы і грошы, навет давалі ёй права голасу на месных соймах, бо цераз іх галасы яны праводзілі ў соймах і гаспадарсьцьвеных установах свае палітычныя і асабістыя пляны. Нагул, шляхта ў той час панавала. Пасьля далучэньня Беларусі да Расеі дробная і чыншавая шляхта згубіла ў вачох паноў былое значаньне. З гэтага мамэнту яна разьдзяляецца, вялікая частка пераходзіць на палажэньне працоўнага элемэнта, а невялікая частка прытарноўваецца да новых варункаў, арандуець зямлю ў паноў, часам становіцца дробным, захудалым панком.

Такім спосабам, „шляхта“ асталася і да гэтага часу. Падзеленыя і раскіданыя прадстаўнікі яе, пераняўшы ад бацькоў польскую культуру і каталіцтва аканчальна прылічылі сябе да палякоў. Яны галоўным чынам і складаюць паказаныя 5 проц. беларускіх „палякоў“.

Нязначная частка шляхты, пераважна каталікі, астаецца верна сваёй беларускай самабытнасьці і займаець сярэдняе палажэньне паміж польскім і расейскім шляхоцкім клясам. Далей мы ўвідзім, што ў глыбі гэтай нязначнай групы, на мяжы, дзьвюх рэлігій –праваслаўнай і каталіцкай, на мяжы дзьвюх цэнтрабежных сіл—польскага і маскоўскага нацыяналізму,—пачаўся так званы беларускі нацыянальны рух, які паставіў на чарод беларускае пытаньне.

Апрача выміраючага шляхоцтва, на Беларусі ёсьць яшчэ кляс паноў-земляўласьнікаў чароднай фармацыі. Уклад яго адносіцца таксама да далёкай мінуўшчыны. Спачатку яго выклікала да жыцьця гістарычная патрэбнасьць. Князі Малыя і Вялікія (арыстакратыя) патрабавалі палкаводцаў, Каб прыцягнуць на службу такіх людзей, трэба было выдзеліць іх з агульнай масы, абдарыць зямлёй (упасьледку дарылі разам з зямлёй і працоўную сілу, сялянства), Кляс гэты, як іх празывалі, баяры, зямяны, магнаты, абавязываліся верай і праўдай служыць свайму пану, а за гэта яны карысталіся ўсімі выгадамі з падараванай ім зямлі, У далейшым працягу ён папаўняўся механічна, з узростам палітычнай моцы і ўплывам тэй ці іншай партыі, вайсковай, рэлігійнай або нацыянальнай групы. Беларускае і літоўскае панства павінна было ўступіць месца польскаму панству, якое шукала для сябе на Беларусі матар'яльнай карысьці і сьвядома нясло сюды каталіцтва і польскую нацыянальную культуру. Польскае панства часам прымушана было уступіць месца маскоўскаму панству, якое праскоўзвала сюды з тымі самымі матамі. Гэткі склад зямянскага кляса даваў яму асаблівыя чырты. Ен ня быў такім чысьленым, як шляхта, але меў вялізарную моц у ўпраўленьні краем і ўладаў вялізарнаю экономічнаю сілаю. Магнаты паступова робяцца гаспадарамі сваіх сялян—падданых, рабоў, і, як казалася вышэй, дастаюць права іх прадаваць, караць сьмерцю, мілаваць. Яны маюць права зьбіраць рады (палякі прынясьлі свой назоў—соймы), выбіраць вялікіх князёў і навет каралёў, выдаваць законы, абвяшчаць і прыймаць вайну.

Улада гаспадара або Малога і Вялікага князя пад уплывам прыйшоўшага сюды магдэбурскага права і польскага шляхоцкага элемэнту пачала агранічвацца яшчэ пры Ягайле. Упасьледку зямянская, або панова Рада (якая пры палякох, пры Ягайле, стала называцца панскім, шляхоцкім Соймам) здабываець значаньне выключна важнай гаспадарсьцьвенай установы. Яна маець сваіх міністраў (канцлер, маршалак, падскарбнік), сваіх месных управіцеляў (ваявода, кашталян, стараста). Яна ставіць свайго кандыдата ў гэтманы,—праваадыры войскаў і вайсковыя судзьзі. Пры Казіміру (1444—1492) зямяне дабіваюцца прывілеяў, якія

*) Гл. № 3 і 4 „Н. Д.“.

скупу Грынявецкаму мыльнае яго становішча і ігнарацыю беларускай справы ў сучасны мамэнт, але трэба. Ні яго старыя годы, ні яго біскупскія фіолеты не даюць яму права паўтараць нашэптаныя яму эндэцкія вымыслы аб беларусах.

Ад. Саладух.

Катэдра беларусазнаўства у Вільні.

З самых старадаўных часоў Вільня, як сталіца беларуска-літоўскага краю, была і навуковым асяродкам гэтага краю.

Гісторыя нашае беларуска-літоўскае навукі, творанай у беларускай, літоўскай, польскай, расейскай і інш. мовах, паказывае нам на вялікае значаньне віленскага навуковага асяродка для самых навет далёкіх усходніх узьмежкаў Беларусі.

Віцебшчына, Магілеўшчына, Смаленшчына, а ня толькі бліжэйшыя віленскія ваколіцы, пасылалі сваіх дзяцей у Вільню даставаць вышэйшую адукацыю і працаваць для навукі.

Сярод многіх беларуска-літоўскіх іменьняў, што як дыяманты блішчаць у гісторыі нашае культуры і яе асяродка Вільні, шмат ёсьць наляжачых людзём з тых далёкіх узьмежкаў.

Слаўны Адам-Ганоры Кіркор, які гэтак многа паклаў працы для навукі беларусазнаўства і літвазнаўства, які гэтак многа зрабіў для Вільні, для яе бібліятэкі і музэю, быў родам з Магілеўшчыны, з м. Сьлівіна, і псэўданім сабе з любосьцю ўзяў ад роднага мястэчка.

Беларускі поэт нова-шляхоцкай школы Арцём Дарэўскі-Вярыга пісаў аб працы Кіркора вось якія шчырыя, наськія, добрыя словы:

Адаська, родны Адаська!
Як мы цешымся з Цябе!
Душа Твая зусім наська,
А горнеш усіх к сабе.
Мурашачка працавіта,
Хвала, брат, сіле тваей!
Як нашыя ў пуню жыта,
Кладзеш усё у музей.
Будзь здароў! Няхай-жа пільна
Так усе робяць свае...

На вялікі жаль, многія дзеці гэтых „сваіх“, засьляплёныя шовінізмам горшага гатунку, забыліся на вялікія і справядлівыя заветы бацькоў, меўшых сьветлы розум. Дзеля сваіх палітыканскіх мэтаў яны гатовы абнізіць навуковае значаньне Вільні ў жыцьці цэлага края да значаньня маленькага шляхоцкага засьценку. Прасторы, на якія Вільня ліла спрадвеку і павінна далей ліць сьвет навукі, яны абмяжаюць да немагчымасьці, да камэдыі. Яны быццам хочуць зрабіць віленскі унівэрсітэт толькі тым, чым была праваслаўная сэмінарыя для чарнагорцаў у Цэціньні на грошы расейскага ўраду.

Але на шчасьце, польскае кіруючае грамадзянства складаецца цяпер не з адных эндэкаў, не з адных паноў і шовіністаў.

І мы верым, што тое ганебнае павучыньне, якім заткааны мазгі горшай і малой часткі грамадзянства, не абаўець сьмяротнасьцю жыцьцё ўсяго польскага народа. Сьвежы вецер запраўднага поступу парвець гнілыя ніці рэакцыі. Польскі народ, у васобе сваіх болей дэмакратычных прадстаўнікоў, разумее, што яму трэба жыць пасуседзку з іншымі народамі, што варагоў нажыць дужа лёгка, але жыць з імі цяжка, што трэба рабіць прыяцеляў...

Падобныя думкі прыходзяць у галаву ад польскай урадовай дэклярацыі, якую старшыня міністраў Вітос падаў Сойму гэтымі днямі.

Як паведамляюць варшаўскія газэты, пан Вітос, між іншым, сказаў болей-меней вось што:

„Урад жадае шыбчэйшага адкрыцьця ўкраінскага унівэрсітэта, які дазволіць нашым суграмадзянам-украінцам рабіць культурную работу на нашых узьмежках.

Гэты факт будзе лішнім доказам таго, што Польшча ў адносінах да сваіх грамадзян іншых нацыянальнасьцяў прызнае сваім абавязкам шанаваць іх грамадзянскія правы і здавальняць іх культурныя і экономічныя патрэбы нараўне з патрэбамі грамадзян-палякоў.

Думаю, што будзе гордасьцю нашай Рэчыпасполітай мець ня клясы грамадзян, а толькі грамадзян роўных, вольных і карыстаючых поўнымі правамі“.

На развагу наводзяць гэтыя пана вітасавы словы. Яны спараджаюць у сэрцы прыемную радасьць, што польская нацыя мае такіх разумных і сумленных людзей, а з другога боку яны спавіваюць думку вялікай прыкрасьцю, што ўчынкі многіх і многіх людзей той-жа нацыі, толькі „Стража-крэсаўскага“ племя і іншых падобных пляменьняў, далёкі ад танаровых слоў пана Вітоса так, як далёкі глухія і ўбогія беларускія вёскі ўсходняе Віленшчыны ад будынку польскага Сойму ў Варшаве!—„До Бога высоко, до царя далеко“—кажа спрадвечная прыказка няшчаснага расейскага народа, і гэтая чужая прыказка маець цяпер у нас поўныя грамадзянскія правы.

Каб пан Вітос лепей ведаў і нашае беларускае жыцьцё, каб ён бліжэй пазнаёміўся і з нашым беларускім адраджэнцкім рухам, то ён пажадаў-бы хутчэйшага адкрыцьця унівэрсітэту і для нас беларусаў.

І прыдзе час новых палітычных адносін, калі ня ён, дык нехта другі скажа тое пажаданьне.

Як тое было, што летась у Вільні, на вядомым, „гістарычным“ мітынгу польскай партыі „Одродзэне“, крыкуны не далі прамаўляць беларускаму дзеячу Умястоўскаму аб патрэбе беларуска-літоўскага сойму ў Вільні, а сёлета тыя-ж крыкуны прост, казаў той, цягнуць беларусаў і ліцьвіноў на віленскі сойм...

Шпаркі лёт часу моцна мяняе жыцьцё.

Зьмяніў ён жыцьцё і ў справе адкрыцьця катэдры беларусазнаўства пры віленскім унівэрсітэце, але на жаль пасунуў яго ня перадам, а задам.

Бо тады, як унівэрсітэт толькі што рыхтаваўся аднавіць сваё істнаваньне ў Афінах гістарычнае Літвы, усе з пэўнасьцю казалі, што пры ім будзе, як найменшае, катэдра для беларусазнаўства і літвазнаўства. Дзейкалі навет, ці праўда ці не, што ўжо былі запрошаны і надта паважныя прафэсары чытаць беларускую мову і літэратуру.

Што-ж мы бачым сёлета?

Замест беларускае катэдры распачаліся лекцыі беларускае мовы, якія чытае прафэсар Масоніус. Мы лішне шануем старасьць гэтага чалавека і яго ранейшую прыхільнасьць да беларускага руху, але мусім прызнацца, што ня меней за тое шануем патрэбы навукі і хочам, каб была навука, а ня курсы аматора. Уважаючы на тую старасьць, можна дараваць бязтактнасьць вучыцеля беларускае мовы, які на пытаньне студэнта у беларускай мове аб навуковых тонкасьцях гэтае мовы дае адказ: „Na korytarzy!“—значыцца, на калідоры можна з ім гаварыць пабеларуску, а на лекцыі ў аўдыторыі—не. Але ня можна дараваць, каб гэты вучыцель, гэты прафэсар, бяручыся за навуковае выкладаньне нашае мовы, дагэтуль ня меў у руках... граматыкі Б. Тарашкевіча!

Ды не ў такіх драбніцах справа.

Пытаньне трэба ставіць выразна і цьвёрда. І мы яго ставім: для патрэб навукі беларусазнаўства павінна быць у Вільні катэдра. Скажам болей: давадзіць, што йначай быць ня можа, уважаем ніжэй за свайго й чужога гонару. Калі адсутнасьць катэдры ёсьць толькі памылка, то хай ня будзе іншага слова, як памылка, і будзем папраўляць гэтую памылку.

З прыватных гутарак я чуў, што генарал Жэлігоўскі ўмее напамяць цэлыя разьдзелы з повесьці „Гапон“ Дуніна-Марцінкевіча, што генарал Мокржэцкі папраўляў у беларускай мове вучняў віленскае беларускае гімназіі, што і іншыя высока стаячыя ў Сярэдняй Літве асобы добра ўмеюць пабеларуску і ведаюць беларускую літэратуру. Мне здаецца, што той, хто ўмее пабеларуску, бязумоўна, любіць і этую мову... Дык хаця-ж ваймя тае ласкі да мовы беларускага народа хай прагучаць вітасавы словы на прасторах Сярэдняе Літвы і хай тыя словы стануцца дзелам. Мне здаецца, што й журналісты тутэйшыя, як Чэслаў Янкоўскі і інш., якіх калісьці штось прымушала пісаць вершык ці другі ў беларускай мове, што і яны павінны, сярод пісаньня кусьлівых рэцэнзый на беларускія кніжкі, добраю парою глыбей глянуць на перажываны час і глыбей урэзаць сваё імя ў добрай гісторыі культуры Літвы, Беларусі і іх сталіцы Вільні.

А. Моьціолаўскі.

Пуцяводныя ідэі беларускае літэратуры.

Баршчэўскі, Рыпінскі і Чачот, Дунін-Марцінкевіч, Вярыга-Дарэўскі, Каратынскі і, урэшце, „апошні з могіканаў“, дажыўшы да нашых дзён, але перажыўшы свой кірунак, Аляксандар Ельскі,—усё гэта прадстаўнікі так-званага „шляхоцкага романтызму“. *) Магутны парыў рэвалюцыі, які, пачаўшыся ў Францыі ў канцы XVIII ст., прайшоў праз усю Эўропу, не сунімаючыся ажно да канца першае паловы XIX ст., прымусіў навет найбольш консэрватыўныя элемэнты задумацца аб адносінах пануючых станаў да народных мас. І пад той час, як перадавыя грамадзяне нашага краю: Хрэптовічы, Манюшкі і інш.—даюць волю сваім „падданым“, верачы, што толькі прабуджэньнем народу „дэмосу“ можна адрадзіць і вызваліць з-пад ярма маскоўскага аўтакратызму нашу бацькаўшчыну,—другія, а ў тым ліку і вышэй пералічаныя пачынальнікі нашага адраджэньня, ня могуць ніяк зыйсьці з свайго становага становішча, ня могуць вызваліцца з сваей шляхоцка-становай псыхолёгіі. Яны—гэтыя шляхоцкія пісьменьнікі—любяць свой народ, сваіх „мілых мужычкоў“, як іх называе Чачот. Яны хочуць памагчы яму прыняць чалавечы воблік, жыць лепшым жыцьцём у сытасьці, дастатку і чыстасьці. Яны змагаюцца з п'янствам і заклікаюць народ да рупнай працы, якая адна толькі можа даць людзём дабрабыт*). Іх рупіць і справа пашырэньня граматы (хоць Рыпінскі йшчэ думае толькі аб польскай). Дунін-Марцінкевіч навет выводзіць свайго героя, „ў людзі“—робіць яго афіцэрам! Але ўсе яны ня мысьляць мужыка йначай, як у падданстве, як „на сваім месцы“. Іх грамадзкі ідэал — патрыархальныя адносіны між два-

*) М. Гарэцкі. Гісторыя Беларускае літэратуры. Вільня, 1920.

*) Гл. „Da miłych naszych mużyczkou“ Ian Czaczot, „Piosnki wiesniacze z-pad Niemna i Dźwiny“ Wilno 1846.

звальняюць ад падаткаў на карысьць гаспадарства. Пры Жыгімонце II Аўгусьце (1564) зямяне дабіваюцца цэнзавога меснага права зямян утвараць месную Раду (соймік) для выбараў „радцаў“, г. ё. дэпутатаў, у краёвую Раду, „Панову Раду“ (Сойм). У пэрыод ад 1572 па 1793 г., ад Стэфана Баторыя да Станіслава Панятоўскага, г. ё. падзела Польшчы, зямянскі, або панска-зямляўласны, кляс, як і кляс шляхоцкі, уцягіваецца ў палітычнае змаганьне і ўвесь аддаецца палітыцы звонку. Наўперадзе йдуць польскія магнаты і вядуць голас у напрамку ўсей яго дзеяльнасьці.

К часу падзела Польшчы зямянскі кляс складаўся пераважна з палякоў і абпалячаных літоўцаў і беларусаў. Кацярына II прымушала гэты кляс прысягнуць расейскай кароне. Генарал-губэрнатар Заходня-беларускіх абласьцей Тутолмін характэрызаваў гэты кляс у такім чародзе.з На першым месцы стаяць магнаты—іх два разьдзелы: што уцяклі у час находу маскоўцаў і асталіся на месцы: на другім месцы стаіць іншая шляхта—яе таксама два разьдзелы: што маюць уласнасьць, нажытую сваёй працай або законным парадкам, і бяздворныя, служылыя.

Каб ясьней сабе прадставіць аб панох і іх маемасьці, я напомню, што ў часе 1-га падзела Польшчы ў ваднэй толькі Магілеўскай губэрні аказалася 3727 чалавек шляхты (дваран), у беларускіх правінцыях Псколўскай губэрні 1.799, у тым ліку ў абедзьвюх губэрнях 1.552 вялікіх паноў — магнатаў, якія ўладалі 58 мясьцечкамі і 10,768 вёскамі з 336.914 чалавек жыхароў.

У заходняй Беларусі па II і III падзелу Польшчы адных толькі цэнзавых паноў, г. ё. паноў, якія мелі права выбіраць у соймы, у Менскай губэрні налічалася больш за 433 і Брацлаўскай—485.

Ува ўсіх паноў у Менскай губэрні было пад прыгонам больш за 390 тыс. чалав., і ў Брацлаўскай—592 тыс. чал. сялян.

Вяльможныя паны часам уладалі цэлымі цяперашнімі паветамі. Найбольш знатныя роды, якія склаліся яшчэ у XVI в. і мелі вялізарныя маёнткі, гэта: Радзівілы, Ходкевічы, Храптовічы, Солямярэцкія, Корсакі, Валовічы. Шмат з гэтых двароў, калі ўладары іх адмовіліся прысягнуць расейскай кароне, па вярхоўнаму загаду былі сэквэстрованы (адабраны) і аддадзены расейскім ваяводам. З гэтаю мэтаю былі сэквэстрованы двары віленскага польскага ваяводы Караля Радзівіла — Невель і Себеж—(1230 вёсак і больш за 15 тыс жыхароў), мясьц. Капыль і Раманаў (72 вёскі і больш за 6 тысячаў чалавек жыхароў), далей двор літоўскага канцлера—паляка кн. Міх. Чартарыйскага (52 вёскі і 1592 чал. жых.), двор літоўскага гэтмана — паляка Міх. Агінскага (25 вёсак і больш за 3 тыс. чал. жых.) і г. д. Былі сэквэстрованы ўсе двары палякоў, якія не захацелі даць прысягу імпэратрыцы Кацярыне.

Такому самаму сэквэстру падпала шмат земляў рымска-каталіцкіх касьцёлаў і манастыроў і розных установаў, як, напрыклад, у Дзьвінскай парахвіі (73 вёскі і 2.011 жыхароў), у Рэжыцкай плябаніі (40 вёс. і 1.241 жых.), у Падгорскім войтаўсьцьве, Залучанскай парахвіі, у Магілеўскай губ., р. к. капітула (77 вёс. і больш за 5 тыс. чал. жых.) і г. д. Сэквэстрованы былі землі дварцовыя, напрыклад, экономіі Полацкая (406 вёс. і 8945 чал. жых.), Віцебская (44 вёс. і 1423 чал. жых.), Магілеўская (61 вёс. і 8945 чал. жых.), Крычэўская (5 мясьц., 148 вёс. і 14.327 чал. жых.). Урэшце былі сэквэстрованы землі каронных старастаў, напрыклад, Вяліжскае кн. Адама Чартарыйскага (больш за 14 тыс. чал.), Гомельскае і Усьвяцкае кн. Міхала Чартарыйскага (больш за 23 тыс. чал. у абодвух), Прапойскае ваяводзівы Бжастоўскай (у Фінляндыі, больш за 4 тыс. чал.), Казянскае Ігната Агінскага (больш за 4 тыс. чал.), Рагачоўскае, Шавінскае, Полацкае, Рэчыцкае і г. д.

Усе гэтыя землі былі падараваны паном з расейскіх дваран і беларускіх, к таму часу ўжо досіць абпалячаных шляхціцаў, якія так ці інакш заслужыліся перад расейскай каронай. Напрыклад, часьць царкоўных земляў была перададзена камэргеру Васільчыкаву, часьць дварцовых земляў была перададзена кн. Мацею Кантакузену (больш за 2 тыс. чал.), Завадоўскаму (больш за 4 тыс. чал.), Рымскаму-Корсакаву (больш за 5 тыс. чал.), Ярмолаву (больш за 4 тыс. чал.), адміралу Чычагову (больш за 3 тыс. чал.), прынцу Нассаў-Зігену (больш за 3 тыс чал.), кн. Пацёмкіну (больш за 14 тыс чал.). З земляў каронных старастаў падараваны гр. П. А. Румянцаву-Задунайскаму (больш за 11 тыс. чал.), гр. Завадоўскаму (больш за 1 тыс. чал.), Безбародцы (больш за 1 тыс. чал.) кн Вяземскаму (каля 3 тыс. чалав.), віцэ-канцлеру Галіцыну (больш за 300 чалав.), генаралу Сіверсу больш за 1 тыс. чал.), гр. З. Т. Чарнышову (больш за 5 тыс. чал.), палкоўніку Шчыту (больш за 4 т. чал.). гр. Н. І. Паніну (больш за 3 тыс. чал.), і гэтак бяз канцу... Усяго стараньнямі Кацярыны пасьля I падзела Польшчы было створана да 200 новых паноў з 180 тыс. чалав. падданых.

(Канец будзе).

ром і вёскай, а п е к а двара над сялянамі. Дзеля гэтага яны вымагаюць ад кожнага пана, каб ён быў добры для сваіх падданых, быццам іх „старшы брат“, „ацец“,—каб ня крыўдзіў, не злоўжываў сваей уласьці над прыгонным людам.

Д о б р ы п а н—п а к о р н ы м у ж ы к. Вось аснова ідэолёгіі шляхоцка-романтычнага кірунку ў нашай літэратуры XIX сталецьця. Захаваньне становага разьдзелу, апека над „недасьпелым“ людам—вось што прабіваецца з кожнага іх твору. Яны навучаюць народ у гэткім духу, ўмаўляюць, каб ён баяўся Бога і слухаў пана, і толькі калі-некалі захопліваюцца хараством народнае поэзіі, адвечных звычаяў і абрадаў, і тады забываюцца аб дыдактызьме, даючы шчыра поэтычныя творы.

Такая літэратура не магла доўга здаволіваць духовыя патрэбы нашага народу. Яшчэ пакуль трываў прыгон, творы нашых шляхоцкіх романтыкаў хоць крыху рассьвятлялі панурае жыцьцё вёскі, малюючы „ідэальных паноў“, якія ня крыўдзяць сваіх паданных. Але як счэзла паншчына, дык і гэта прынада ў вачах народу утраціла сваю павабнасьць. І народ, каторы ў памяці, ў жывым слове перахоўваў творы пачынальсікаў нашага адраджэньня, захоўвае на нягоньняшн дзень адно толькі некаторыя адрыўкі гэтых твораў, вольныя ад дыдактызму і захопліваючыя сваей красачнасьцю, сакавітасьцю (напр. апісаньне гулянкі ў карчме ў І песьні „Гапона“ Дуніна-Марцінкевіча і інш.) І ўвесь шляхоцка-романтычны кірунак зжыўся, не здалеўшы ў душы народу запаліць тэй сьвятой іскры, каторая падняла-бы яго да новага, вольнага і сьвядомага жыцьця.

Але на шляхоцкім романтызме сьвет клінам для нашага народу ня зышоўся. Тыя вялікія, сьветлыя ідэі, каторыя, йдучы на нас з Францыі, натхнулі лепшыя душы нашых паноў адрачыся ад сваіх прывілеяў і правоў над сялянствам,—тыя самыя ідэі пранікаюць і да нізоў народных. Яны будзяць народ зо-сну. Яны даюць магчымасьць сялянам шырэй глянуць на сьвет, на сучасныя адносіны, на сваё палажэньне. Перад народам на мамэнт, быццам маланка, праносіцца тая „праўда“, якой далейшыя пакаленьні ўжо ня кідаюць шукаць, якая трывожыць „добрых паноў“ Марцінкевічаўскага тыпу. І вось мы бачым нарадзіны першага сьвядомага мужыцкага поэта XIX ст.: Паўлюк Бахрым з Крошына, чатырнаццацігадовы гадунец кс. Магнушэўскага, пачынае пісаць вершы, а зьмест іх такі, што за іх хлопчыка па загаду сэнатара Новасільцава, здаюць у салдаты... Вось гэты мала вядомы, поўны глыбокага трагізму вершык загубленага ў маладыя годы песьняра, за які так цяжка яго пакаралі:

Зайграй, зайграй, хлопчык малы,
і ў скрыпачку, і ў цымбалы,
а я зайграю у дуду,
бо ў Крошыне жыць ня буду.
Бо ў Крошыне пан сярдзіты:
Бацька кіямі забіты,
маці тужыць, сястра плача, —
гдзе-ж ты пойдзеш, небарача?
Гдзе я пайду? Мілы Божа!
Пайду ў сьвет, у бездарожжа,
ў ваўкалака абярнуся,
сьлёзна на вас азірнуся...
Будзь здарова, маці міла!
Каб ты мяне не радзіла,
каб ты мяне не карміла,
шчасьлівейшая ты-б была!
Каб я каршуном радзіўся,
я-бы без паноў абыўся:
у паншчыну-б не пагналі
і ў маскалі не аддалі.
Мне пастушком век ня быці,
а ў маскалёх трудна жыці;
а я і расьці баюся:
гдзе-ж я, бедны, абярнуся?
Ой, кажане, кажане!
Што-ж ня сеў ты на мяне,
каб я больш не падрос
ды ад бацькавых калёс!..

(гл. „Маладая Беларусь“, III, 1913).

Песьняра паны і начальства загубілі. Але думкі, якія ён выяўляў у сваіх вершах, не маглі загінуць. І яны далей жылі дзесь падысподам, захаваныя на самым дне душы мужыцкай, і моцня раз яшчэ выяўляліся ў вершах сярмяжных поэтаў, аб якіх мы ня можам нічога ведаць. Іскра, якая будзіла народ і кіравала да шуканьня свае загубленае „праўды“, якая на мамэнт заясьнела ў Паўлюку Бахрыме, ня тухне ў найцяжэйшыя часы.

Пачынаюць разумець гэта і тыя з паноў, якія бліжэй стаяць да народу, да вёскі, якія адчуваюць тое, што думае народ. І вядомы «лірнік» вясковы», Сыракомля, ў адзіным дайшоўшым да нас яго беларускім вершу, зрываючы ўсялякую сувязь з патрыархальна-ідылічным тонам сучасных яму шляхоцкіх романтыкаў, ўдарае ў новы тон: тон прымірэньня вёскі з дваром на новых асновах, як р о ў н ы з р о ў н ы м. Верш гэты таксама мала вядомы ў цэласьці. У ім Сыракомля гэтак адклікаецца на рэвалюцыйны рух у Заходняй Эўропе ў 1848 годзе:

Добрыя весьці.

Заходзіць сонца пагодняга лета
і веець вецер з заходніх нябёс.
Здароў будзь, вецер! З далёкага сьвета
добрыя-ж весьці да нас ты прынёс?
Здаровы-ж будзьце, эй, добрыя весьці!
Там, на Заходзе, праліваюць кроў,
б'юцца для славы, свабоды і чэсьці
і робяць вольных людзей з мужыкоў!
Гудзяць вясёла і песьні і танцы
у добрым жніве на шчасьлівы год.
Годзе вам, годзе, вы цары-паганцы,
таптаць з балотам хрышчоны народ!
Годзе вам, годзе у яснай карэце—
годзе, чыноўнікі, ды езьдзіць у двор!
Годзе вам, годзе, мужыцкія дзеці
з хаткі астаткі ды браць на пабор!
І панскае дзецка, і хамская юха
з аднэй кватэркі папіваюць мёд
і прысягнулі на век да абуха,
быць сабе вольны і роўны народ.
Мужык і шляхціц засядзе на лаве,
каб вясьці раду аб сваёй зямлі;
як трэба думаць аб грамадзскай спразе,
на адно мейсца, як браты, прыйшлі.
А як урадзім вайну на грамадзе:
бараніць дзеткі і зямлю і дом,—
мужык і шляхціц на каня усьсядзе
касіць касою, рубіць тапаром!
Эй, згінець вораг як Бог нам памажа
за нашу крыўду, за горкі наш жаль
Запяем песьню: „Хваліць цябе, Божа“
—лягчэй будзе сэрцу, як згінець маскаль.
Зямля ты наша! Зямля ты сьвятая!
Радзі нам збожжа, ды судзі пажаць!
Ня прыйдзе вораг з маскоўскага края
на магазын наша зерня браць!
Ручыць рукою худоба ў хаце;
паны мужыцкіх сьлёз не забяруць!
Мужык з панамі стаіць за-пан-браце,
рука за руку, грудзі за грудзь.
Пяром на карце, ды сахой на ніве
адзін другому роўнасьць засьцярог.
Эй, у свабодзе зажывём шчасьліва,
мы будзем дзеткі, а наш бацька—Бог!

(„Варта“ № 1, 1918 г.)

Праўда, тут яшчэ чуюцца адгалоскі шляхоцкага сьветагляду,—дык гэта толькі далёкія адгалоскі. Сыракомля ўжо чуе моц народных мас, верыць у гэту моц і жадае для народу месца, якое яму і ў радзе і ў вайне па праву прыналежыць. Задоўга да скасаваньня прыгону—ў 1848 годзе—Сыракомля прарочыць, што ўжо йдзе той час, калі „паны мужыцкіх сьлёз не забяруць“. І тады—ён верыць—настане агульнае шчасьце.

Яшчэ далей ідзе Костусь Каліноўскі, гэты незабыты мучанік за „праўду народную“, аддаўшы за яе сваё маладое жыцьцё. Каліноўскі, вядомы пад псеўданімам „Яська гаспадар з-пад Вільні“, першы тутэйшы дзеяч, праняўшыся ідэолёгіяй Гэрцэна, першы ініцыятар беларускае народнае школы *), прынімае ўчасьце ў польскім паўстаньні 1863 году, але разам з тым уносіць яго новы элемэнт— э л е м э н т ш ч ы р а д э м а к р а т ы ч н ы і н а ц ы я н а л ь н а б е л а р у с к і. Пад яго націскам паўстанчаскі ўрад выдае адозвы да беларускіх сялян пабеларуску, абвяшчаючы народу роўныя правы з шляхтай. Сам Каліноўскі закладае ў Беластоку патайную друкарню і ў ей друкуе шэсьць нумэроў беларускай часопісі „Mużyckaja Praŭda“. Калі-ж праз здраду нягодных людзей яго арыштоўваюць у Вільні жандары і аддаюць пад суд, ад якога ён ня жджэ нічога, апрача кары сьмерці,—Каліноўскі ў вастрозе (ў сьв.-Янскіх мурах) піша ў прозе і ў вершу пажагнаньне свайму народу, першы раз надрукаванае ў „Гомане“ (№ 1, 1916 г.). Вось одпісы гэтых перадсьмертных твораў Каліноўскага: 1) „Беларусы, браты мае родныя! Зпад шыбеніцы маскоўскай прыходзіцца мне да вас пісаці і можа раз астатні! Горка пакінуць зямельку родную і Цябе, дарагі мой Народзе! Грудзі застогнуць, забаліць сэрца, але ня жаль згінуць за Тваю праўду!

„Прыймі, Народзе, па шчырасьці маё слова перадсьмертнае, бо яно якбы з таго сьвету толькі для дабра Твайго напісана.

„Нямаш, браткі, большага шчасьця на гэтым сьвеце, як калі чалавек мае розум і навуку. Тады ён толькі можа быць у радзе, жыць у дастатках і тагды толькі, памаліўшыся Богу, заслужыць Неба, бо, збагаціўшы навукай розум, разаўе сэрца і народ свой цэлы шчыра палюбіць. Але як дзень з ноччу ня ходзіць разам, так і навука праўдзіва ня йдзе разам з няволей маскоўскай. А пакуль яна ў нас будзе, у нас нічога ня будзе. Ня будзе праўды, багацтва і ніякай навукі, адно намі як скацінай варочаць будуць не для дабра, адно на пагібель нашу. . . . . ваюй, Народзе, за сваё чалавечае і народнае права, за сваю веру, за сваю зямлю родную. Бо я Табе зпад шыбеніцы кажу, Народзе, што тагды толькі зажывеш шчасьліва, калі над Табой маскаля ўжо ня будзе!“

Яська з-пад Вільні.

II.) Беларуска зямелька, галубка мая! Гдзе-ж ся падзела шчасьцё і доля Твая? Усё прайшло, прайшло, як-бы ня бывала, адно страшэнна горыч у грудзях застала. Калі за нашу праўду Бог нас стаў караці дый у прадвечнага суду вялеў прападаці,—т мы прападзем марна, а праўды ня кінем, хутчэй Неба і шчасьце, як праўду абмінем! Не наракай, Народзе, на сваю бяздолю, а прыймі цяжкую кару—Прадвечнага волю. А калі мяне успомніш, шчыра памаліся, то я з таго сьвету Табе адзавуся. Бывай здаровы, даражэнькі Народзе! Жыві у шчасьці, жыві у свабодзе і часам спамяні пра „Яську“ Твайго. А калі слова пяройдзе у дзела, бо адно з праўдай у грамадзе згодна дажджэшся, Народзе, старасьці свабодна!

Ня будзем гаварыць аб форме вершу. Ня будзем затрымліваціа і на тэй процімаскоўскай тэндэнцыі, якая тады пранікала ўсе свабодалюбівыя элэмэнты ў нашым краю. Адьначым затое адну рысу, якой дагэтуль мы ні ў кого з нашых песьняроў ранейшае пары не сустракалі, якую можна знайсьці хіба ў аднаго Міцкевіча ў яго імпровізацыі ў III часьці „Дзядоў“, дзе поэт зьвяртаецца з вызавам да Бога. Такі вызаў робіць і Каліноўскі: ён дапускае, што Бог карае народ за „нашу праўду“, ён кліча сваіх братоў беларусаў, каб хутчэй зракліся Неба і шчасьця, чым адступіліся ад свае праўды. І гэтак стаіць за справу народнага вызваленьня чалавек, для каторага на Лукішках ужо стаўляюць шыбеніцу,—чалавек, як-ніяк, вераны, бо просіць маліцца за яго.

„З а п р а ў д у н а р о д н у ю“ з таго часу йдуць усё новыя і новыя сыны нашага народу. За „праўду“—значыць, за волю, за шчасьце, за ўсё тое, што народ па справядлівасьці павінен мець у жыцьці і чаго ня мае.

А. Навіна.

(Працяг будзе.)

---

*) Гл. «Наша» № 1 1916 г.

З польскае работніцкае прэсы.

Работніцкі орган „Паходня“ у № 15 ад 30 студня г.г. піша аб тым, як стараецца „Стража Крэсовая, „Адрадзеньне“ і іншыя нацыяналістычныя арганізацыі падманіць людзей абяцанкамі раю на зямлі ў разе далучэньня Віленшчыны да Польшчы.

Газэта недаўмявае: ці яшчэ Віленшчына фактычна не далучана да Польшчы? Бо новая Урадуючая Камісія, на пацеху Стражы Крэсовай, усё робіць па загаду з Варшавы. „Паходня“ піша:

„Запраўды так ёсьць. Але ці палепшылася ад гэтага хоць троху палажэньне работніцкага клясу і вясковай беднаты? Ці зьменшыўся ў нас голад і холад, страшэнная дарагоўля і безрабоцьце? Ці дасталі безьзямельныя і малазямельныя зямлю? Ці ня вісіць над намі пагроза новай вайны? На жаль ад фактычнага далучэньня Віленшчыны да Польшчы нічога не зьмянілася і ня зьменіцца“

Далей газэта дае адказ, чаму так эндэкі партыйныя і „беспартыйныя“ крычаць і зьбіраюць подпісы усё аб адным: «Да Польшчы! Да Польшчы!»

„Для таго каб адвярнуць увагу працоўнага люду ад яго запраўдных патрэб, удзержыць яго ад змаганьня за паляпшэньне свайго палажэньня, прыцягнуць яго да сябе і тым самым узмоцніць упливы буржуазіі. Для таго, каб — вярней удзержыць свае двары, камяніцы і добрыя пасады ў сваіх рукох“.

Л. Г.

Ня сьпі!

Ня сьпі, мой браце, не чакае
Ідучы ўперад хутка час!
Цяпер мінута дарагая,
Мінута важная для нас.

Прасьпіш ты гэтую мінуту
І не спагоніш сто гадоў,
Скажы ты ясна: хочаш путаў
Ці вольным стаць без ланцугоў?

Уперад, гэй, браты, да працы,
Зьніштожым цемру мы датла,
Збудуем славы мы палацы,
Палацы волі і сьвятла.

Ігнат Дварчанін.

Сьняжынкі.

Эх, круціцесь, сьняжынкі, круціцесь
Над пакорнай, маўклівай зямлёй..
Прылашчыце яе, прытуліцесь
Да палёў, агалёных зімой,

Лес, шляхі, ручаі, што сьціхаюць
Абвяжыце парчой сьнегавой.
Паглядзіце—усе вас чакаюць:
Не шапочуць лісты між сабой,

Не глядзіцца у лужынкі сонца
І ня жаліцца дрэвы яму,
А ад іньня гараць валаконцы
Павучыньня ў заціхшым гаю.

Паглядзіце, як хвоі схіліліся,
Як маркоцен рад тонкіх асін,
Навет кісьці чырвоныя зьбіліся
Абляцеўшых у садзе рабін.

Над лясамі, над цэлай зямлёю
Эх, круціцесь, сьняжынкі, барджэй!
Абагрэйце іх ласкай сваёю,
На душы, можа стане лягчэй..

Натальля Арсеньнева.

1920 г.

Адыйдзі-ж ты, гора!..

Не заўсёды неба хмарамі акрыта,
Не заўсёды смуткам сэрцайка спавіта..
Адыйдзі-ж ты, гора, адыйдзі, благое,
Бачыш—там ясьнее неба галубое.
Не хачу я плакаць, сьветла ўсё і міла,
Што было—мінула, ўсё я пазабыла,
Бо ня вечна неба хмарамі акрыта,
Як ня вечна смуткам сэрцайка спавіта.

Натальля Арсеньнева.

1920 г.

Весткі з Савецкай Фэдэрацыі

Дармавая абробка палеў.

У Савецкай Расеі выпрацаван плян дармовай абробкі зямлі трактарамі (паравымі плугамі). Пакуль што у Расеі ёсьць усяго прыгодных 604 трактары, але к налецьцю савет спадзяецца дастаць з-за граніцы 3000 трактараў.

Савецкі урад проціў забастовак.

У Расеі Савецкім урадам выдадзен дэкрэт, па якому ўсякі, хто адмаўляецца стаць на працу, будзе пасаджаны ў турму ад аднаго да пяцёх гадоў, а ад сям'і яго адымаецца паёк.

Афіцыяльнае зьняпраўджаньне чутак аб паустаньнях на Украіне.

Маскоўскае радзіо даводзіць да ведама: „Чужаземная прэса распаўсюджвае чуткі, быццам украінскія сяляне паўсталі проціў саветаў і адзяржалі новую пабеду на паўноч—захадзе ад Кіева і зьніштожылі ў Макараве чырвоны гарнізон. Газэты паведамляюць, што паўстанцы наступаюць цяпер на Кіеў. Усе гетыя весткі непраўдзівыя. На Украіне, а асабліва ў Кіеўскім раёне, усім спакойна“.

Савецкая Беларусь.

МЕНСК, 1 лютага (Орыент). Тут адбыуся зьезд беларускіх, дзеячоу. Пастаноулено адчыніць вышэйшую беларускую школу, а таксама інстытут беларускае культуры. Урад Савецкай Беларусі рыхтуецца выдаць шмат беларускіх творау, а таксама беларускі слоунік. Выкладовао мовао у школах Беларусі будзе толькі мова беларуская.

Паустаньне у Ігуменскім павеце (Менскай губ.).

Маскоўскія „Известия“ пішуць, што ў Ігуменскім павеце „шайкі бандытаў“ за кароткі час разагналі пагарэльскі і якшынскі валасны рэўком, адбілі у „райпродкома“ 800 пудоў жыта і прымусілі павятовую ўладу скасаваць свае аддзелы. Апрача таго, што дня здараліся выпадкі нападаў і ўбійстваў прадстаўнікоў савецкае улады. Экспэдыцыйнаму атраду ўдалося разьбіць „бандытаў“, якія разьбегліся па павету групамі па 7-8 чалавек. На чале шаек быў паміж іншым валасны вайсковы камісар Бялічэнскі.

ШТОДЗЕННЫЯ ВЕСТКІ.

Пятніца, 28 студня 1921 г.

РУМЫНІЯ мабілізуецца. Паклікаены тры гады.

САВЕЦКІ УРАД апублікаваў паведамленьне, што ў яго няма намераў зноў пачаць вайну вясною.

ПОЛЬШЧА рэгіструе чужаземцаў.

ТУРЦЫЯ. Ангельцы паведамляюць, што ў войсках Кемаль-пашы бунт.

УКРАІНА і ВЕНГРЫЯ. З Масквы даходзяць весткі, быццам украінскі атаман Пятлюра змаўляецца з вянгерскім урадам аб дапамозе змагацца з бальшавікамі на Украіне.

Субота, 29-га студня 1921 г.

ГРЭЦЫЯ і ТУРЦЫЯ. Грэкі здолелі зьдзержыць войска Кемаль - пашы ля Сьмірны.

НЯМЕЧЧЫНА. У Вестфаліі знайшлі баявую камуністычную арганізацыю, мэта якой была — стварыць чырвоную армію для бліжэйшага пахода.

УКРАІНА. Маскоўскія „Известия“ паведамляюць, што чырвоная армія адабрала Кіеў ад украінскіх паўстанцаў, а Канеў пакуль што не.

Нядзеля, 30 студня 1921 г.

ПОЛЬШЧА. Сойм прыняў законапраект аб сэнаце ў Польшчы невялікаю большасьцю галасоў правых дэпутатаў.

УЛЬТЫМАТУМ НЯМЕЧЧЫНЕ. Хаўрусьнікі пастанавілі запрапанаваць Нямеччыне поўнае і бесьпярэчнае выпаўненьне ўсіх варункаў версальскае ўмовы да 1-га мая. Калі яна к таму часу іх ня споўніць, хаўрусьнікі прымусяць яе аружнаю сілаю.

Панядзелак, 31-га студня 1921 г.

РАСЕЯ. З Масквы паведамляюць што памёр вядомы анархіст П. Крапоткін, маючы 78 гадоў.

ГРУЗІЯ прызнана Антантаю de jure (па праву).

ТУРЦЫЯ цярпіць страшэнную патрэбу ў грашох. Урадоўцы не дастаюць пэньсіі з кастрычніка (акцябра) 1920 г.

Аўторак, 1 лютага 1921 г.

АМЭРЫКА. Безработных ў Амэрыцы болей за 3 міліёны.

САВЕЦКАЯ ФЕДЭРАЦЫЯ прызнала ў сваім складзе новыя рэспублікі: Дагестанскую і Горную.

Серада, 2-га лютага 1921 г.

ПОЛЬША. Пан Падэрэўскі астаецца польскім прадстаўпіком у Лізе Народаў.

— Пан Пілсудзкі выехаў 1-га лютага ў Парыж.

САВЕЦКАЯ РАСЕЯ. У Маскве ў лютым адбудзецца зьезд яўрэйскай партыі „Бунда“.

У Пецярбурзе праф. Максімаў знайшоў спосаб фарбянай фотографіі, а праф. Ігнатоўскі выдумаў кінематаграфічны апарат без мітусеньня.

Горадзеншчына.

Газэта „Беларускае Слова“ ў Горадні зачынена польскімі уладамі.

З распараджэньня Варшаўскага Міністэрства Унутраных Справаў Горадзенскі стараста Рагалевіч аддаў 21.I. 1921 г. прыказ Горадзенскай „państwowaj policji“ зачыніць газэту «Беларускае Слова».

Некалькі паліцэйскіх у працягу 2 гадзін рабілі дэталічную рэвізію у памяшканьні рэдакцыі. Перавернута было усё. З прычыны позьняга часу нікога ў рэдакцыі ня было. Вымушаным сьведкам пры рэвізіі быў адзін выпадкова прысутны ў друкарні складальнік. Забраты рукапісы, расьпіскі, рахункі; урэшце дьверы былі запячатаваны пячаткай паліцыі.

Мусіць быць, нічога карнага знайдзена ня было, бо праз 3 дні пячаткі былі зьняты. Вочам прыйшоўшых супрацоўнікаў рэдакцыі прадставіўся малюнак страшэннага хаосу: сталы, шапы парасчынены, кучы папераў на падлозе. Відаць было, што рэвізія была надта дэталічная і шчыраяҗ і тэга — у рэдакцыі тэй газэты, якая увесь час свайго істнаваньня—а выйшла яе 77 нумароў — клікала сваіх чытальнікаў „да згоднага супольнага жыцьця двох братніх народаў—беларусаў і палякоў“. Газэта, здавалася часамі, навет занадта была лойяльна—і усё-ж не пазбавілася рэпрэсіяў: № 65 яе быў старастам сканфіскаваны, а цяпер ім-жа і зусім зачынена, прычым ад друкарні Мейлаховіча узята падпіска, што друкавацца газэта ня будзе.

З боку некаторых беларускіх партыяў і групаў гэты сьвежы яшчэ цяпер нябожчык выклікаў іншы раз незадаваленьне сваім кірункам, але ён усё-ж будзіў нацыянальную беларускую сьвядомасьць. Цяпер і ён спынен і беларуская люднасьць на „terenach pryfrontowych i etapowych“, дзе налічаецца яе да 3 міліёнаў, апынулася без свайго органу.

Сумна!

Як мы даведаліся ад супрацоўнікаў „Бел. Слова“, папера старасты аб зачыненьні газэты зусім не паказывае на матывы зачыненьня, проста: „jest prze zemnę zawieszona“, і толькі. Варшаўскія-ж польскія газэты, мусіць з інфармацыяў, паходзячых ад Міністэрства Унутраных Справаў, пісалі, што нібы „Бел. Слова“ распаўсюджывала нацыянальную барацьбу, барацьбу клясавую (праўда, эн-дэкаў яна ніколі не хваліла) і, урэшце, падкопывала аўторытэт ўлады на мясцох. Мы, чытальнікі, ніколі гэтага заўважыць не маглі. Навет польская газэта, выходзячая у Вільні—„Słowo Żołnierskie“ у свой час зьвяртала ўвагу сваіх чытальнікаў на „Бел. Слова“, як на такую газэту беларускую, з кіраўнікамі якой польскае прогрэсыўнае грамадзянства можа ахвотна працаваць. І ўсё-ж... „Бел. Слова“ зачынена.

Будзем спадзявацца, што гэта страшэнная памылка Варшаўскага Міністэрства Унутраных Справаў будзе папраўлена дэмократычным грамадзянствам Польшчы, і яно павінна гэта зрабіць, каб палепшыць беларуска-польскія адносіны, якія пагаршаюцца з кожным днём, дзякуючы нездаровай палітыцы на беларускіх абшарах на захад ад Рыжскае лініі, і прымушаюць навет лойяльныя беларускія групы зьняверывацца ў магчымасьці такой-сякой супольнай згоднай працы.

Чытальнік „Беларускага Слова“.

АД РЭДАКЦЫІ. Адначасна з атрыманьнем гэтае корэспондэнцыі мы даведаліся, што і украінская газэта „Впэрэд“, якая выдавалася ў Львове у працягу колькіх гадоў, таксама на гэтых днёх зачынена.

Аб закрыцьці Горадзенскага Беларускага Нацыянальнага Камітэту.

(Ад уласнага корэспондэнта).

Як гром сярод яснага дню ударыла у Горадні вестка аб зачыненьні Беларускага Камітэту Горадзеншчыны. Хоць хмары нібы-то і зьбіраліся, бо эн-дэцыі надта не падабалася праца Камітэту у пашырэньні беларускае сьвядомасьці сярод сялянства Горадзеншчыны, але усе-ж мы, беларусы у Горадні, не спадзяваліся, каб Міністэрства Унутраных Справау пайшло у сьлед за даказчыкамі, часта людзьмі злой волі, і зрабіла такі памылковы крок, псуючы гэтым і без таго дрэнныя польска-беларускія стасункі у Горадзеншчыне, дзе у гэты пявыразны час пры наладжываньні адміністрацыі і гаспадарчага жыцьця трэ было-б дбаць аб тактоўных адносінах да беларускіх грамадзкіх арганізацыяў ды і да беларускага пытаньня наагул.

Зусім магчыма, што у гэтым годзе Камітэт, які павеу быу значна шырэй нацыянальную працу, чымсь летась, больш мазаліу вочы польскім эндэкам і не давау ім спакою. Дзеля таго яны так і узбурыліся. Зараз-жа пайшло у ход, што і бальшавікі сядзяць у Камітэце і—калі шырака вядуць працу — дык мусіць і працуюць на нейкія цемныя грошы, бо даказчыкі добра, мусіць, ведаюць, што каб звaліць якога ненавісьніка, дык досыць даць кляймо бальшавіка—і гатова.

Спынена чыннасьць Камітэту, запячатваны намешканьні усіх аддзелау Камітэту. І Дабрачынны Аддзел яго, які апекавауся над беднымі дзяцьмі, цяпер працаваць ня можа і дзеці у прытулку жывуць без хлеба і у нятопленым памяшканьні ужо колькі дзён.

Прадстаунікі Цэнтральнага Беларускага Нацыянальнага Камітэту зложылі па усе гэта пратэст у Варшаве, у Міністэрсьцьве Унутраных Спраў і зьвярнуліся з адкрытым лістом да польскага грамадзянства у гэтай-жа справе.

С. М.

З Літоўскага жыцьця.

У Літоўскім Установчым Сойме.

Газэта „Віленскій Курьеръ“ у № 454 ад 24 студня 1921 г. паведамляе, што з 17-га студня аднавіліся паседжаньні Літоўскага Устаноўчага Сойму.

Уступную прамову сказаў старшыня Сойму п. Стульгінскі.

Міністр заграгічных спраў д-р Пурыцкіс з усіх бакоў асьвятліў паміжнароднае становішча Літвы.

Аб польска-літоўскім канфлікту міністр сказаў, паміж іншым: „Ня гледзячы на тое, што ў гэты канфлікт умяшалася Ліга Народаў, яна нічым не памагла яго разрашэньню“.

Аб польска-літоўскіх перагаварах у Варшаве д-р Пурыцкіс адазваўся:

„Мы былі надта ўступчывымі ў перагаворах з палякамі. Дзеля таго няма чаго дзівіцца няверы нашых грамадзкіх кругоў да дзейнасьці Лігі Народаў і Кантрольнай Камісіі“.

Аб адносінах да Савецкай Расеі д-р Пурыцкіс сказаў:

„Мы ня можам ня лічыцца з Савецкай Расеяй, бо там асталося больш за 200 тысячаў нашых упекачоў і міліярдная маемасьць. Літва ўжо даволі пазнала смаку розных акупацый, і новых акупацый, з чыйго б яны ня былі боку, яна не павінна дапусьціць.

Што датычыцца плебісцыту, аб якім усё гавораць палякі, то мы зусім не баімся яго разультатаў. Мы ведаем, што яўрэі і беларусы паддзяржаць нас, (аглушаючыя воплескі; дэпутаты ўстаюць і вітаюць прадстаўніка Беларусі). Але на плебісцыт у нашай гістарычнай сталіцы Вільні мы ніколі ня згодзімся. Вільня была і астанецца сталіцаю Літвы“.

Літоускія дэпутаты у Вільні.

У Вільню прыбывае дэлегацыя літоўскіх палітычных партыяў у тым ліку, некалькі дэпутатаў сойму, належачых да партыі людоўцаў. Сярод дэпутатаў— Кайрыс, Ромэр, Венцлаўскі і інш.

Школьны аддзел.

Пісьмо дырэктара Беларускаи Гімназіі.

Паважаны пане рэдактар!

У некаторых віленскіх польскіх газэтах за 29 студня зьявілася заметка пад загалоўкам: „Ген. Мокжэцкі ў школах“, дзе сказана, што старшыня Урадуючай Камісіі Сярэдняе Літвы ген. Мокжэцкі быў вельмі задаволен усім відзеным ім у польскай гімназіі Зыгмунда Аўгуста, тады як „w gimnazjum białoruskiem uderzyła zwiedzających niemae powszechna wśród uczniów niezmiernie slaba znajomość języka białoruskiego i wypływającą stąd obfitość wykładów w języku rosyjskim“,

2) рэлігія праваслаўная і жыдоўская у беларускай гімназіі выкладаюцца парасейску,

3) „lekcje języka polskiego „chwilowo„ nie odbywają się wcale“.

Лічу сваім абавязкам унесьці некаторыя дапаўненьні і папраўкі да сказанага ў заметцы.

Генарал Мокжэцкі разам з дырэктарам дэп. асьветы п. Ліхтаровічам і сваім ад'ютантам адведалі беларускую гімназію у час, калі йшла апошняя (шостая) лекцыя. У малодшых клясах гімназіі, уключна да 4-ай, дзе усе навукі выкладаюцца пабеларуску, лекцый ужо ня было.

Ген. Мокжэцкі і дыр. Ліхтаровіч разам са мною адведалі лекцыі Зак. Божага у 5 і 6 клясах. Спачатку былі на лекцыі ў прат. М. Пліса (правасл.), потым у кс. А. Станкевіча (рым.-катал.) і наастатку п. Абрамовіча (іудзейск.) У працягу 30-35 мінут былі ў трох розных клясах. Прыймаючы пад увагу усё гэта, мне і думаецца, што аўтор заметкі «ген. Мокжэцкі ў школах» ня меў права пісаць аб нязьмерна слабай амаль агульнай знаёмасьці сярод вучняў беларускай мовы, бо казаць аб агульнасьці, пазнаёміўшыся толькі з аднэю часткай агулу (гімназіі), можа чалавек, каторы ня ведае ці ня прызнаець навукі лёгікі.

І мне і ўсім, хто блізка знае склад вучняў беларускай гімназіі, не сакрэт, што сярод іх ёсьць, асабліва у старшых клясах, слаба ведаючыя беларускую мову. Гэта тыя, хто жыў увесь час не на вёсцы, а ў горадзе, адкуль беларуская мова і культура у папярэдні пэрыод гісторыі нашага краю былі выціснута—амаль ня зусім—мовамі і культурай польскай і расейскай. Такіх вучняў гімназія навучае беларускай мове, літэратуры, гісторыі і географіі і, мае добры з гэтага вынік: сярод вучняў старшых клясаў, ня ўмеўшых раней беларускай мовы, выкрысталізоўваюцца ўжо нацыянальна-беларускія таленты ўва многіх сфэрах мастацкаи творчасьці.

Есьць польская прыказка „Nie adrazu Krakow zbudawany“.

Калі так, то трэба мець цярплівасьць і ў адносінах да адбудаваньня беларускай школы, каторая, як і іншыя нацыянальныя школы (літоўская, латыская, эстонская і г. д.) перажылі і яшчэ перажываюць пераходны пэрыод, пасьля толькі што скончанага пэрыоду прымусовай русіфікацыі.

Ня трэба таксама забывацца ў якіх цяжкіх варунках, як матар'яльных так і палітычна-грамадзкіх, прыходзіцца ўвесь час працаваць беларускім нацыянальна-культурным дзеячом. Няма грошы на школьныя падручнікі, на сьвятло, на апал, на рэмонт школы, няма самаму на што жыць. За адно тое, што ты беларус, цябе лічаць адны—контр-рэвалюцыянэрам, другія — бальшавіком.

Вось чым выклікаецца затрыманьне ў найскарэйшым пераходзе з расейскай на беларускую мову. Былі-б патрэбныя грошы, была-б добрая воля памагчы,— і беларуская школа наагул, як і Беларуская гімназія у Вільні, ня прымушаны-б былі падчас карыстацца не па сваёй ахвоце расейскай мовай і расейскімі падручнікамі.

У канцы павінен адзначыць, што ня гледзячы на розныя перашкоды, у Віленскай беларускай гімназіі да 4-й клясы ўключна ўсе навукі выкладаюцца пабеларуску, пачынаючы-ж з 5-ае некаторыя—пабеларуску, а некаторыя—парасейску, як напрыклад матэматыка, дзеля адсутнасьці падручнікаў.

Польская мова не выкладалася у гім-

назіі з той прычыны, што вучыцелька захварэла вачыма і настолькі сур'ёзна, што патрэбна апэрацыя. Але што-ж зробіш, навет цяжкая хвароба вучыцелькі для такіх спагадчыкаў усяго беларускага, як аўтор заметкі, зьяўляецца плэважнай прычынай і маю аб гэтым заяву ген. Мокжэцкаму мой „прыяцель“ бярэ пад сумленьне. Выходзіць, быццам я змавіў ген. Мокжэцкаму. Няхай-жа спраўдзіць і сябе і мяне пан аўтор, і тады яму будзе сорамна.

Дырэктар Вілен. Беларускай Гімназіі Міх. Кахановіч.

1/II—1920 г.

Пісьмо у рэдакцыю.

Грамадзянін Рэдактар!

Будзьце ласкавы надрукаваць у Вашай паважанай газэце зьняпраўджаньне. У стацьці „Культурнае адраджэньне“ у № 2 „Нашае Думкі“ за 1921 г. між іншым было надрукавана, што ў Лебедзеўскай воласьці ў вёсцы Насілаве вучыцелька, заявілаўшысь, што яе з прычыны няўменьня роднае мовы не назначылі вучыцелькай ў беларускую школу, самадумам заклала ў вёсцы Насілаве маскоўскую школу. А было гэта вось як. Вучыцелька гэта родную мову добра знае і любіць яе; дастаўшы ад кіраўніка беларускіх школ Лебедзеўскай воласьці назначэньне ў Насілаўскую школу, яна згукала сход бацькоў, каторыя хацелі пасылаць сваіх дзяцей у беларускую школу. На гэтым сходзе бацькі рады былі, што ў іх будзе школа і згадзіліся прывязьці дроў, зрабіць парты і знайсьці кватэру пад школу. Наагул было ўсё прыгатавана да адкрыцьця школы, але да гэтай справы ўбіўся насілаўскі сьвяшчэньнік Александроўскі. Ен павёў агітацыю процiў беларускай школы. Урэшце школа была адчынена не вучыцелькай, а сынам гэтага сьвяшчэньніка і не беларуская, а маскоўская.

Вучыцелька А. Кузьняцова.

Школьныя весткі з Ашмяншчыны.

Школьная справа ў Ашмянскім павеце стаіць ня надта дрэнна але ня зусім і добра. Гэтак ня толькі ў Ашмянскім пав., а і ў Валожынскім. Чаму я дзялю нашыя школы на два паветы, Ашмянскі і Валожынскі? Бо, можа, да ўсіх вас яшчэ не дайшлі весткі аб гэтым. Валожын, як і прылягаючыя воласьці—Юрачыская і Трабская—прылічаны да Польшчы і маюць назоў: Валожынскі павет Новагрудскае губэрні. Хаця такім спосабам адарвалі ад майго району дзьве воласьці, Юрачыскую і Трабскую, засталася толькі адна Гальшанская, але сяляне Валожынскага павету часта прыяжджаюць да мяне з рознымі пытаньнямі аб іх школах. Чым магу я іх усьцешыць? Толькі адным: „Чакайце“.

Доўга сядзіць селянін і думае сваю думку цяжкую, нарэшце ўстае, ўздыхае, жаліцца...

Сеў ён на забітага пастаяннай стапковай яздой каня і паціху паплёўся да хаты.

На другі дзень прыйдзе або прыедзе з другой вёскі з тымі самімі пытаньнямі, пасядзіць, гаразважае разам са мною сваё гора і з сумнымі думкамі едзе да хаты.

Навет вучыцялі, папы, і тыя часта задаюць мне пытаньне, чы атрымаем мы пэнсію за студзень і люты, чы можна сьмела вучыць дзяцей пабеларуску, бо заўтра можа прыехаць са Стражы Крэсовай і зачыніць школу...

Аднак, ня гледзячы на ўсе гэтыя перашкоды, ў маім школьным раёне ёсьць шаснаццаць беларускіх пачатковых школак, а ня трачу я надзеі, што да палавіны лютага будзе ня меней дванцацёх. Задзержываецца пакуль далейшае адкрыцьце школак за недастаткам вучыцялёў.

Школьны інструктар С. Шыманскі.

Новая беларуская гімназія.

Па жаданьню жыхароў мястэчка Шаркаўшчыны, Дзісьненскага павету там адчыняецца беларуская гімназія ў ліку 5 клясаў. Арганізатар і дырэктар грам. Балай. Часова мясьціцца будзе у будынку народнае школы. Маецца ўжо болей за 60 заяў.

З Беларускага жыцьця.

Гуртуйцеся!

Шмат хто з сялян, жыву чы ў глухой вёсцы, нічога ня ведае аб палітычным жыцьці сьвета і свае старонкі Беларусі. Газэт спрадвеку ня чытае, а цяпер, можа, паслухаў-бы, як другія чытаюць, дык або пошты няма, або баіцца пайці на падобную зборку, каб якінебудзь панок з „Стражы Крэсовай“ не заарыштаваў яго. Так і жыве, як крот у зямлі, дзень да вечара, чакаючы зямлі і міру.

А як прыдзе бяда, як пачнуць яго неўспадзеўкі і бяз дай прычыны крыўдзіць, рабаваць яго дабро, адным словам як пачуе кулак вельмі ўжо блізка да свайго карку, тады ня ведае, дзе яму дзецца, да каго ўцякаць з жальбою, у каго шукаць ратунку.

Як вераб'і ад шубня разьлятаюцца на канапляях хто-куды, так неарганізаваныя нашы сяляне разьбягаюцца пры відзе ворага хто-куды і не бароняць таго, хто ўцячы не пасьпее і трапіць у бяду.

Аж дзіва і сорам бярэ, што шмат дзе беларускія сяляне аж дагэтуль ня ведаюць, што у Вільні ёсьць Беларускі Нацыянальны Камітэт, які ёсьць прадстаўніком арганізаванага беларускага грамадзянства і бароніць яго ад усякіх напасьцей і крыўдаў.

Дык гуртуйцеся, браты, беларускія сяляне!

Закладайце свае нацыянальныя арганізацыі і дзяржыце зьвязак з паватовымі камітэтамі і з Вільняю. Пасылайце жальбы на пісьме, а ў разе патрэбы—наўмысных хадакоў.

Выпісывайце „Нашу Думку“. Няпісьменныя прасіце пісьменных прачытаць вам яе і разьясьніць незразумелае. Пасылайце сваіх дзетак у школу, каб навучыліся чытаць вам газэту. Выпісывайце газэту ў коопэратывы і школы. Пасылайце ў рэдакцыю заметкі аб усім, што баліць. Пішыце, як умееце.

Дзед Кузьма.

Штраф.

Віленскі беларускі ксёндз Адам Станкевіч аштрафован на 1000 марак за тое, што не паслаў ў Аддзел друку Дэпарт. унутр. Спраў (начальнік Чэслаў Янкоўскі) на прагляд п'ескі для дзяцей нябожчыка Алеся Гаруна „Хлопчык у лесе“. П'еска была пастаўлена на карысьць віленскага беларускага дзіцячага прытулку.

Тутэйшае жыцьце.

Лекцыі беларускае мовы.

У віленскім унівэрсітэце прафэсар М. Масоніус кожную сераду па дзьве гадзіны, ад 4 да 6 увечары, чытае лекцыі беларускай мовы.

Новыя правілы аб друку.

Вышаў дэкрэт ген. Жэлігоўскага ў справе друку і прэсы. Артыкул 17 гэтага дэкрэту кажа: „Асобы, вінаватыя ў агляшэньні спосабам друку твораў, маючых у сабе заклікі выступаць супроць арміі, хістаючых аўторытэт уладаў, падбіваючых да клясавага і нацыянальнага змаганьня ці заклікаючых нягслухацца выданных правілаў і загадаў, будуць падлягаць штрафу да 100.000 марак“ і г. д. Штраф для маламожных будзе замяняцца арыштам. „Асобамі, вінаватымі ў гэтым прыпадку, могуць быць аўтор, выдавец і рэдактар, кожны паасобку і ўсе разам“.

Сплау дрэва.

За сплаў дрэва па Вільлі да Вільні бярэцца 100 марак ад кожнага прыгнанага сажня.

Кара сьмерцьцю.

Вайсковы суд пастанавіў пакараць сьмерцьцю абвінавачаных у замаху на ген. Жэлігоўскага і іншых Бачковага, Зелянковага, Закгейма, Вейсбаха, Корсакавага, Башкіравага, Захаравага і Сьвечнікавага з просьбаю аб замене кары сьмерцьцю катаргаю. Абвінавачаныя Абрам Галуб засуджаны на 4 гады турмы, а Соня Стругач на 6 гадоў.

Наймаюць біцца.

На тым тыдні ў Вільні, як піша „Виленское Слово“ ў № 134, былі прадстаўнікі ангельскага ўраду, якія за вялікія грошы наймалі дабравольцаў у тую ангельскую армію, што зьмірае пацьстаўшую Ірляндыю.

Плата за рэквізыцыі.

Бюро дэлегата польскага ўраду ў Вільні паведамляе, што з мэтаю паквітаваньня за рэквізыцыі, зробленыя у насяленьня польскім войскам, утворана Галоўная Нядзвычайная Камісія, а такcама і выязныя гмінныя камісіі. Дзеля прызнаньня стратаў служаць дакумэнтамі рэквізыцыйныя квіткі ці паказаньні сьведкаў і пацярпеўшых.

Выбары у Сойм спыняюцца.

ДЭКРЭТ № 74.

Галоўнакамандуючага войск Сярэдняй Літвы па пытаньню аб спыненьні распараджэньня № 23 ад 14 сьнежня 1920 г. аб выбарах.

Згаджаючыся з жаданьнем Ураду Польскай Рэспублікі, выказаным у пісьме да мяне № 149 ад 31 студня г. г. і прызнаючы правільнымі зьмешчаныя ў ім доказы,—даю гэтакі загад:

Выпаўненьне распараджэньня № 23 ад 14 сьнежня 1920 г. спыняецца на неазначаны час.

1 лютага 1921 г.

Жэлігоўскі

Галоўнакаманд. войск Сярэдн. Літвы.

Віленская біржа (гэльда).

1 лютага

Царскія 500 р. . . .	2300	польск. мар.
„ 100 . . .	435	„ „
„ дробныя	150—360	„ „
„ 10 р. золатам	3500	„ „
„ 1 р. серабром	180	„ „
Думскія 1000 р. . . .	820	„ „
„ 250 . . .	630	„ „
Кярэнскія	140	„ „
Доляры	820	„ „
Фунты	2350	„ „
Франкі франц. . . .	51	„ „
Нямецкія маркі . .	1300	„ „
Осты	1250	„ „
Савецк. 5 і 10 т. за 100	4—5	„ „

ІНФОРМАЦЫЙНЫ АДДЗЕЛ.

Бібліатэка Беларускага Навуковага Т-ва будзе адчынена дзеля карыстаньня на месцы для навуковых мэт ў памяшчэньні Т-ва пры Вострабрамскай вул. № 9.

Беларускае Выдавецкае Т-ва выдае ўсялякія кніжкі ў беларускай мове Сябраў прымае Урад Т-ва. Уступная плата — 50 м., сяброўская гадавая складка — 100 м. Адрэс Т-ва: Віленская вул. № 3, кв. 1 (адчынена ад 4 да 5 гадз. у дзень).

Бібліатэка б. „Знаніе“ мае багаты выбар кніжак да чытаньня ў розных мовах. Адчынена: 10—1 і 3—6 гадз. Адрэс: Віленская 33.

Беларуская Кнігарня „Беларускага Выдавецкага Т-ва“ мае на прадажы ўсе беларускія кніжкі. Адрэс: Завальная 7.

Беларускі Нацыянальны Камітэт месьціцца ў Вільні, Вострабрамская, 9, пакой № 5. Старшыня Ф. Ярэміч, Робіцца рэгістрацыя беларусаў даецца духоўная і матар'яльная помач.

1-я Віленская Беларуская Гімназія месьціцца на Вострабрамскай вул., 9. Дырэктар М. Кахановіч, інспэктар А. Дмахоўскі.

Беларускія пачатковыя школы ў Вільні. 1) Кальварыйская, 73; 2) Лідзкі тракт, могільнік; 3) Радунская, 27-а; 4) Зарэчча, Панамарская, 12. Навука бясплатная. У кожнай школе даецца дзяцём сьнеданьне.

Беларускі Школьны Аддзел. Вільня, Каўкаская вуліца (рог Вялікай Пагулянкі), 2, другі паверх, налева, пакой № 13.

Беларускі Вучыцельскі Саюз Канцэл. 1-й Віленскай Беларускай Гімн.

Прытулак Камітэта Помачы. Вострабрамская, 9 (будынак гімназіі). Загадчыца Л. Васілевіч.

Віленскі Саюз Коопэратываў Малая Погулянка, дом № 12

Коопэратыў „Райніца“ ў Вільні. Вялікая Пагулянка, 17.

Коопэратыўная друкарня „Друк“, Вільня, Вострабрамская, 5 (Пасаж). Там-жа Беларускае Выдавецтва У. Знамяроўскага.

Дазволена Ваеннаю Цэнзураю. Рэдактар-Выдавец М. ГАРЭЦКІ Кооп. Друкарня „ДРУК“, Вострабрамская 5.